# КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫ ПАСЛЯАКУПАЦЫЙНЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Андарала А. І г. Мінск, БДТУ, дацэнт
Андарала І. А. г. Мінск, ІПД, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да пачатку 40-х гадоў у Беларусі была створана і паспяхова функцыянавала рацыянальна арганізаваная сістэма падрыхтоўкі педагагічных кадраў, якая ўключала тры тыпы педагагічных навучальных устаноў:

- педагагічныя вучылішчы (да 1937 года называліся педагагічнымі тэхнікумамі) з трохгадовым тэрмінам навучання (на базе няпоўнай сярэдняй школы) – рыхтавалі настаўнікаў пачатковых класаў;

- настаўніцкія інстытуты з двухгадовым тэрмінам навучання (на базе сярэдняй школы) – рыхтавалі настаўнікаў 5-7 класаў;

- педагагічныя інстытуты з чатырохгадовым тэрмінам навучання (на базе сярэдняй школы) – рыхтавалі настаўнікаў 8-10 класаў.

У студзені 1940 года з мэтай падрыхтоўкі настаўнікаў для школ заходніх абласцей, далучаных да рэспублікі, былі адкрыты педагагічны інстытут у Беластоку, настаўніцкія інстытуты ў Баранавічах, Гродне, Пінску і 6 педагагічных вучылішчаў (Беласток, Брэст, Гродна, Маладзечна, Пінск, Навагрудак) [1, с. 412].

У цэлым перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны сетка педагагічных навучальных устаноў БССР, якія рыхтавалі настаўнікаў для агульнаадукацыйнай школы, уключала 5 педагагічных, 9 настаўніцкіх інстытутаў і 18 педагагічных вучылішчаў. Уся сістэма педагагічных вучэбных устаноў мела дзённае і завочнае аддзяленні. Як вынік – напярэдадні вайны агульнаадукацыйныя школы рэспублікі, за выключэннем школ заходніх абласцей, былі практычна поўнасцю ўкамплектаваны кваліфікаванымі настаўнікамі. Нвучальны працэс у агульнаадукацыйных школах рэспублікі ажыццяўлялі 60724 настаўнікі, большасць з якіх мела сярэднюю і вышэйшую педагагічную адукацыю [2, л. 187].

За гады акупацыі агульнаадукацыйнай школе рэспублікі, акрамя матэрыяльнага, быў нанесены вялікі кадравы ўрон, які з самага пачатку пасляакупацыйнага адраджэння агульнаадукацыйнай школы рэспублікі істотна стрымліваў дзейнасці школ і нармалізацыю вучэбнага працэсу ў іх. Сведчаннем таму з’яўляецца той факт, што для забеспячэння вучэбнага працэсу ў агульнаадукацыйных школах, якія распачалі сваю дзейнасць на вызваленай тэрыторыі рэспублікі ў 1943/44 навучальным годзе, патрабавалася 12329, а ў наяўнасці было толькі 7513 настаўнікаў. Такім чынам, дэфіцыт настаўніцкіх кадраў у першы пасляакупацыйны год складаў 4816 чалавек, або 40 % ад патрэбнай школам колькасці [3, л. 6]. Найбольш востра праблема педагагічных кадраў адчувалася ў заходніх абласцях рэспублікі. Так, у Палескай вобласці ў 1943/44 навучальным годзе не хапала 1030 настаўнікаў [3, л. 4]. З прычыны адсутнасці іх у вобласці не змаглі ўзнавіць сваю дзейнасць 60 школ [4, л. 25].

Складаная сітуацыя з педагагічнымі кадрамі склалася ў сувязі з тым, што тысячы кваліфікаваных настаўнікаў рэспублікі знаходзіліся ў радах дзеючай арміі і ў эвакуацыі ва ўсходніх раёнах СССР. Многа настаўнікаў загінула на фронце. Тых жа, хто заставаўся на акупіраванай тэрыторыі, нямецка-фашысцкія захопнікі разглядалі як патэнцыяльных удзельнікаў руху Супраціўлення і падвяргалі жудасным рэпрэсіям. Многія з настаўнікаў былі расстраляны, павешаны, вывезены на прымусовую працу ў Германію. Аб маштабах рэпрэсій у дачыненні да настаўнікаў з боку акупантаў яскрава сведчаць наступная факты. У Баранавічах за гады акупацыі ад рук захопнікаў загінула 68, у Навагрудскім раёне – 52 настаўнікі. Усяго ў Баранавіцкай вобласці загінулі 248 настаўнікаў і 83 былі вывезены ў Германію [6, л. 12]. У Скідзельскім раёне захопнікі знішчылі 50 настаўнікаў [5, л. 94]. У Гомелі былі павешаны і замучаны 44 настаўнікі [5, л. 62].

У дадатак да вышэйадзначанага праблема адсутнасці кваліфікаваных педагагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ рэспублікі ў першы пасляакупацыйны год абвастралася па той прычыне, што многія дыпламаваныя настаўнікі працавалі не па спецыяльнасці, а ў савецкіх, партыйных і гаспадарчых структурах. Акрамя гэтага, да педагагічнай дзейнасці не дапускаліся многія з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі ці дыскрэдаытаваў сябе па іншых прычынах. Так, у Гомельскай вобласці ў час акупацыі настаўнікамі працавалі 2097 чалавек [5, л. 62].

Ва ўмовах вострага дэфіцыту педагагічных кадраў працаваць настаўнікамі ў школы, асабліва ў сельскія, прыйшла моладзь без адпаведнай адукацыі і педагагічнага вопыту. Нярэдка выкладалі нават малаадукаваныя людзі. Напрыклад, у школах Магілёўскай вобласці ў 1943/44 навучальным годзе з 2128 працуючых настаўнікаў толькі 121 чалавек (5%) мелі вышэйшую адукацыю. У той жа час – 285 (13%) настаўнікаў мелі толькі сярэднюю адукацыю, а 377 (18%) – не мелі нават сярэдняй адукацыі [5, л. 3]. У Палескай вобласці ў першы пасляакупацыйны год працавала 1454 настаўнікі. З іх вышэйшую адукацыю мелі 54 чалавекі (4%), 70, або 5% – незакончаную вышэйшую, 725 (49%) – сярэднюю адукацыю, 337 (23%) – не мелі сярэдняй адукацыі [5, л. 22]. З 2616 настаўнікаў школ Гомельскай вобласці 1251 чалавек, або 44% ад агульнай колькасці, мелі сярэднюю адукацыю, 909 чалавек, або 34,5% сярэдняй адукацыі не мелі [5, л. 79]. Падобная сітуацыя з прафесійнай адукацыяй настаўнікаў школ у першы пасляакупацыйны навучальны год была і ў іншых абласцях Беларусі.

Востры дэфіцыт кваліфікаваных педагагічных кадраў негатыўна адбіваўся на якасці працэсу навучання і ўзроўні ведаў навучэнцаў, паколькі па прычыне адсутнасці падручнікаў роля настаўніка ў ажыццяўленні вучэбнага працэсу значна ўзрастала.

З мэтай вырашэння кадравай праблемы ў сістэме школьнай адукацыі кіраўніцтва рэспублікі прымала разнастайныя меры. Адной з такіх мер быў выклік настаўнікаў, якія знаходзіліся ў эвакуацыі ва ўсходніх раёнах СССР. Да верасня 1944 года было выслана 6283 такія выклікі. Усе настаўнікі, якія прыбывалі ў рэспубліку з эвакуацыі, павінны былі праходзіць абавязковую рэгістрацыю ў Наркамаце асветы або абласных аддзелах асветы з наступным размеркаваннем непасрэдна ў школы. У выніку да пачатку 1944/45 навучальнага года ў рэспубліку вярнулася з эвакуацыі і стала на ўлік у Наркамасветы 1146 чалавек. Значная частка рээвакуіраваных настаўнікаў зарэгістравалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непасрэдна ў абласных аддзелах народнай адукацыі. Так, у Палескім аддзеле – 240, у Магілёўскім – 111 настаўнікаў [4, л. 107–108].

Па ўзгадненні з урадам рэспублікі наркомам асветы быў выдадзены загад, у адпаведнасці з якім павінны былі выяўляцца і брацца на ўлік усе асобы, якія мелі педагагічную адукацыю, але не працавалі па спецыяльнасці. Іх бралі на ўлік і накіроўвалі ў распараджэнне абласных аддзелаў народнай асветы. Аднак вяртанне настаўнікаў з ліку непрацуючых па спецыяльнасці ў школы адбывалася вельмі складана. Гэта было абумоўлена тым, што ва ўмовах вострага дэфіцыту кваліфікаваных кадраў у вызваленых раёнах настаўнікі мелі перавагу пры ўладкаванні на работу ў партыйныя і дзяржаўныя органы, адміністратыўна-кіруючы апарат прадпрыемстваў, што прываблівала больш высокім сацыяльным статусам і большай матэрыяльнай зацікаўленасцю, чым школы. Па гэтай прычыне значная частка непрацуючых па спецыяльнасці настаўнікаў знаходзіла самыя розныя падставы, каб не вярнуцца да педагагічнай дзейнасці.

Наркамасветы рэспублікі таксама прымаліся меры па ўзнаўленні падрыхтоўкі настаўнікаў у педагагічных і настаўніцкіх інстытутах, педагагічных вучылішчах. Першым (15 сакавіка 1944 г.) пачаў сваю дзейнасць Рагачоўскі настаўніцкі інстытут. У сувязі з тым, што вучэбны корпус інстытута быў поўнасцю разбураны ў ходзе баявых дзеянняў, заняткі пачаліся ў Мазыры. Колькасць студэнтаў, прыступіўшых да вучобы ў інстытуце, складала 210 чалавек [7, л. 20]. 31 мая 1944 г. пачалі работу Гомельскі педагагічны і настаўніцкі інстытуты. Першы – ў складзе 4 факультэтаў: прыродазнаўства, мовы і літаратуры, фізіка-матэматычнага і гістарычнага. Другі – у складзе прыродазнаўча-геаграфічнага і гісторыка-філалагічнага аддзялення [7, л. 115]. 29 ліпеня 1944 г. СНК БССР прыняў рашэнне аб узнаўленні дзейнасці Мінскага дзяржаўнага педагагічнага і настаўніцкага інстытутаў. Педагагічны – у складзе пяці факультэтаў: мовы і літаратуры, гістарычнага, замежных моў, педагагічнага і бібліятэчнага. Настаўніцкі – двух факультэтаў: мовы і літаратуры, замежных моў. План прыёму на дзённыя аддзяленні ўсіх курсаў складаў 710 чалавек: педагагічны інстытут – 450, настаўніцкі – 260.  На завочныя аддзяленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

факультэтаў планавалася залічыць 850 чалавек [7, л. 262]. Паралельна з педагагічнымі і настаўніцкімі інстытутамі, па меры вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад захопнікаў, узнаўлялі сваю дзейнасць і педагагічныя вучылішчы.

Аднак для падрыхтоўкі настаўнікаў для агульнаадукацыйных школ інстытутамі і вучылішчамі патрабаваўся даволі працяглы тэрмін, значныя сродкі і матэрыяльныя рэсурсы. Таму для хуткага вырашэння вострай кадравай праблемы, якая існавала ў школьнай адукацыі, было вырашана рыхтаваць настаўнікаў, асабліва для пачатковай школы, праз курсавую сістэму. Летам 1944 года праз 3-х і 6-месячныя курсы ў цэлым па рэспубліцы было падрыхтавана 1222 настаўнікі, затым яшчэ 2781 – для работы ў 1-4 класах. Гэта папаўненне ні ў якім разе не задавальняла патрэбы агульнаадукацыйных школ ні ў колькасных, ні ў якасных адносінах. Асноўная маса настаўнікаў, падрыхтаваных на 3 і 6-месячных курсах мелі школьную падрыхтоўку ў аб’ёме 8, 7, 6 і нават 5 класаў [4, л. 25].

Праблема недахопу настаўніцкіх кадраў, якая востра адчувалася агульнаадукацыйнай школай Беларусі ў першы пасляакупацыйны навучальны год, нягледзячы на меры, якія прымаліся ў рэспубліцы, так і не была вырашана да пачатку наступнага навучальнага года. Па дадзеных Наркамата асветы, на пачатак 1944/45 навучальнага года для школьнай адукацыі рэспублікі патрабавалася 35272 настаўнікаў, а мелася 29917. Недахоп настаўнікаў складаў 5355 чалавек. З гэтага ліку не хапала 4414 настаўнікаў для 1-4 класаў і 941 – для 5-10 класаў [4, л. 105].

Асабліва крытычным заставаўся стан з забеспячэннем школ кваліфікаванымі настаўнікамі ў заходніх абласцях рэспублікі. Так, для арганізацыі вучэбнага працэсу ў школах Гродненскай вобласці ў 1944/45 навучальным годзе патрабавалася 2914 настаўнікаў. У наяўнасці ж было толькі 1708 чалавек. Не хапала 1000 настаўнікаў пачатковых класаў і 294 настаўнікі для 5-10 класаў. З 1414 настаўнікаў, працуючых у 1-4 класах, педагагічную адукацыю мелі толькі 520 чалавек. З 894 настаўнікаў, якія працавалі без адпаведнай адукацыі, 305 чалавек нават не закончылі сярэдняй школы [4, л. 68].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Баранавіцкай вобласці не хапала 530 настаўнікаў: па 1-4 класах – 349, па 5-7 класах – 139, па 8-10 класах – 42 настаўнікі [4, л. 90].

Літаратура:

1. Народная адукацыя і педагагічная думка ў Беларусі (1917–1945) / Г. Р. Сянькевіч [і інш.]. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 495 с.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 21.

3. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 22.

4. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 28.

5. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 29.

6. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 34.

7. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 4. Спр. 266.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ